Тамара Мінкіна



# У ЧЫМ СІЛА БІБЛІЯТЭКАРА?

Дырэктар
Цэнтралізаванай бібліятэчнай
сеткі Шклоўскага раёна

У Александрыйскай сельскай бібліятэцы ўтульна наведвальнікам усіх узростаў. Асноўная ўвага тут надаецца рабоце з дзецьмі. Выхаванне любові да роднай зямлі і арганізацыя іх вольнага часу з'яўляецца прыярытэтным напрамкам дзейнасці бібліятэкі. Трэба адзначыць, што з 2019 г. бібліятэкай рэалізуецца мэтавая праграма «Книга – твой лучший друг», якая прадстаўляе комплекс мерапрыемстваў па папулярызацыі кнігі і чытання, павышэнні інтэлектуальнага ўзроўню дзяцей і падлеткаў, развіцці іх чытацкага густу. У традыцыйную работу мясцовы бібліятэкар уносіць новыя ідэі, вядзе актыўны пошук нестандартных метадаў, распрацоўвае інтэрактыўныя формы, арганізуе акцыі, конкурсы, творчыя выставы, праводзіць літаратурныя круізы, прэм'еры кніг, бібліяквэсты, флэшмобы.

З мэтай развіцця творчых здольнасцей дзяцей у бібліятэцы функцыянуе аматарскае аб'яднанне «АРТ-ДЭКОР». Тут засвойваюць асновы малюнка, жывапісу і нават батыку. Дзецям цікава аплікацыя, з задавальненнем займаюцца і папулярным зараз відам рукадзелля – скрапбукінгам. З паперы, тканіны, прыродных матэрыялаў афармляюць паштоўкі, фотарамкі, альбомы і многае іншае. Заняткі арганізуюцца для розных узроставых груп, прымеркаваных да якоганебудзь свята ці пэўнай даты ў календары. Творчыя работы адрозніваюцца крэатыўнасцю, нясуць шчырыя эмоцыі і пазітыў. Калектыўныя работы членаў аматарскага аб'яднання накіраваны на згуртаванне дзяцей, навучанне сумеснай творчай дзейнасці: «У пошуках папараць-кветкі», «Восеньская пара». Тэме малой радзімы прысвечана дэкаратыўная кампазіцыя «Мая Александрыя», выкананая ў тэхніцы вышыўкі злічальным крыжам. У цэнтры кампазіцыі знаходзіцца Дрэва жыцця, якое сімвалізуе сувязь са сваім родам і пачатак новага жыцця. Да Дня беларускай вышыванкі агульнымі намаганнямі створана дэкаратыўнае пано «Слухай родную мову». У час работы над пано дзеці даведаліся пра асаблівасці беларускага касцюма, навучыліся адрозніваць асобныя элементы вышыўкі і іх значэнне. Нездарма «АРТ-ДЭКОР» – актыўны ўдзельнік і неаднаразовы прызёр раённых, абласных, рэспубліканскіх і міжнародных творчых



Бенефіс чытача «У сяброўстве з кнігай праляцела лета»



ТОП 5 лепшых кніг

конкурсаў: міжнароднага інтэрнэт-конкурсу «Солдатам Победы посвящается!», рэспубліканскага конкурсу дзіцячага малюнка «Подружись со спортом», анлайн-конкурсу малюнкаў «Мы выбираем жизнь», рэспубліканскага конкурсу праектаў «Электромарафон-2020», міжнародных акцый «Книговички», «Книжка на ладошке» і інш. На занятках, якія праводзяцца для розных узроставых груп, удзельнікі акунаюцца ў атмасферу творчасці, развіваюць свае здольнасці, праяўляюць сябе як асоба.

Варта звярнуць увагу на тое, што ў 2022 г. распрацаваны інавацыйны праект летніх чытанняў «КНИГОсветное путешествие», які складаецца з дзевяці маршрутаў. Удзельнікі чытанняў атрымалі «Карту маршрутов литературных круизов», спіс кніг для чытання і творчыя заданні па прачытаных кнігах у выглядзе віктарын і крыжаванак. Чытацкія фармуляры ўдзельнікаў пазначаліся спецыяльным знакам-індыкатарам. За кожнае мерапрыемства ўдзельнікі праекта атрымлівалі вясёлы смайлік-чытайлік. Каб маршруты «Кнігасветнага падарожжа» сталі пазнавальнымі для дзяцей, былі арганізаваны квэст-гульні «По следам любимых книжек», «Книжные детективы», бібліятэчны фестываль «Разноцветные Холи-краски», акцыя «Книжное ассорти», пазл-рэслінг «Турнир настольных игр», конкурс буклукаў «Моя любимая книга». Цікава прайшла квэст-гульня «Краіна мая незалежная».

Да 140-гадовага юбілею класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы ў бібліятэцы арганізаваны конкурс чытальнікаў «З Купалам у сэрцы», падчас правядзення якога дзеці прачыталі самыя вядомыя і любімыя з дзяцінства вершы паэта.

Мясцовыя жыхары ганарацца тым, што штогод у аг. Александрыя праходзіць рэспубліканскае свята «Купалле», якое лічыцца адным з самых любімых свят беларусаў. Бібліятэка прымае актыўны ўдзел у гэтым мерапрыемстве і традыцыйна праводзіць на Шклоўскім падворку майстар-клас па пляценні купальскіх вянкоў. Праходзяць цікавыя мерапрыемствы з мэтай знаёмства з гісторыяй і традыцыямі святкавання Купалля. Мінулым летам тут прайшоў бібліяквэст «Купальская ноч». Удзельнікі мерапрыемства ў гульнёвай форме пазнаёміліся з традыцыямі нашых продкаў, іх адносінамі да прыроды, а таксама з міфічнымі істотамі, прысутнымі ў асяроддзі беларусаў. За кожнае пройдзенае выпрабаванне даваліся рознака-


Выстава-пазнанне «Падарожжа па кніжнай галактыцы»

ляровыя пялёсткі, з якіх па заканчэнні квэста была зроблена папараць-кветка. І як вынік – дэкаратыўная кампазіцыя «Купалінка», якая з’яўляецца своеасаблівым сімвалам купальскага свята.



Гадзіна краязнаўства «Беларуская вышыванка»

У межах праекта добра зарэкамендавалі сябе і «Рознакаляровыя дні» ў бібліятэцы, калі кожны дзень адпавядаў пэўнаму колеру і быў прысвечаны асобнай кніжнай тэматыцы. Наведвальнікам прапаноўваўся рознакаляровы калейдаскоп мерапрыемстваў: чырвонаму колеру быў прысвечаны «Дзень сунічкі», сімвалам Дня жоўтага настрою стаў дзьмухавец, Дзень сіне-блакітнага настрою быў прымеркаваны да Сусветнага дня кітоў і дэльфінаў. У вясёлае падарожжа па фіялетавай краіне адправіліся рабяты ў Дзень фіялетавага настрою, дзе пазнаёміліся з кніжнай экспазіцыяй «Загадкі фіялетавых кніг» у жанры фэнтэзі.

З кнігамі серыі «Рассказы Деда Природоведа» пазнаёміў Дзень зялёнага настрою. Менавіта гэтыя кнігі былі прапанаваны для знаёмства з жывёльным і раслінным светам нашай краіны, цікавымі фактамі і малавядомымі з’явамі прыроды. Юныя чытачы прынялі ўдзел у цікавым экалагічным квэсце «Сокровища Деда Природоведа», які дапамог зразумець, як добра дзеці ведаюць прыроду сваёй краіны. Задача – прайсці «экалагічныя станцыі» і правільнам выканаць заданні. Больш за ўсё зацікавіла дзяцей «Игротека Деда Природоведа», якая прапанавала выкананне розных заданняў на ўвагу і кемлівасць. Усе паспяхова справіліся з імі і засталіся задаволеныя карысным баўленнем часу ў бібліятэцы.


Рознакаляровы дзень «Аранжавага настрою»

Добра працавала «Веселое Ателье Художника», дзе прайшлі майстар-класы, выставы дэкаратыўна-прыкладной творчасці і дзіцячага малюнка «Краски лета», «Солнечный львенок», «Веселая Совушка», пасяджэнні ў творчых майстэрнях «В компании фантазеров», «Мозаика детского отдыха», «Мир в цветах радуги» і інш. Дзеці падавалі творчыя работы ў форме водгукаў, вершаў, апавяданняў, малюнкаў, дэкаратыўных вырабаў па тэматыцы прачытаных кніг.

Безумоўна, на сённяшні дзень дзейнасць бібліятэкі немагчыма без выкарыстання сучасных інфармацыйных тэхналогій і інтэрнэт-прасторы, якія забяспечваюць доступ да не-


Летняя літаратурная экспедыцыя «Жывуць на свеце кніжкі»

абходнай інфармацыі вялікай колькасці карыстальнікаў. Звесткі аб рабоце Александрыйскай сельскай бібліятэкі рэгулярна размяшчаюцца на сайце Шклоўскай бібліятэчнай сеткі (http://lib-shklov.mogilev.by/). Бібліятэка вядзе сваю старонку ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» (https://vk.com/public212613943), дзе змяшчае інфармацыю аб праведзеных мерапрыемствах, фотаздымкі ўдзельнікаў і пераможцаў творчых конкурсаў, рэкламныя відэаролікі.

Нельга не сказаць, што ў рамках праекта «КНИГОсветное путешествие» быў арганізаваны анлайн-конкурс малюнкаў «Мир в цветах радуги», фотамарафон «Мы везде читаем летом», дзень сэлфі «Библиолето-2022». Свае малюнкі і фотаздымкі дзеці размяшчалі на бібліятэчнай старонцы «ВКонтакте». Водгукі аб прачытаных кнігах пакідалі юныя чытачы, якія прынялі ўдзел у форуме ў сацыяльных сетках «Голосуй за книгу», флэшмобе «Я о книге расскажу». Для забеспячэння хуткага доступу да старонкі бібліятэкі ў сацыяльнай групе выкарыстоўваецца QR-код, які размяшчаецца на рэкламных выданнях, прысутнічае на выставах бібліятэкі, выступае эфектыўным спосабам пошуку інфармацыі аб бібліятэцы і яе дзейнасці, прадастаўлення неабходных звестак для чытача.

Такім чынам, бібліятэкай назапашаны багаты вопыт удзелу ў міжнародных анлайн-конкурсах, сеткавых марафонах і акцыях, што з'яўляецца сродкам папулярызацыі бібліятэкі, кнігі і чытання, спосабам заявіць пра сябе ў прафесійным асяроддзі, садзейнічае ўмацаванню сяброўскіх сувязей з калегамі. Сярод іх – акцыі па папулярызацыі творчасці рускіх пісьменнікаў, экалагічным выхаванні, прасоўванні асноў бяспекі жыццядзейнасці, выхаванні здаровага ладу жыцця, якія арганізуюць бібліятэкі Яраслаўля, Уфы, Самары, Бранска, Навасібірска, Луганска і іншых гарадоў і пасёлкаў Расійскай Федэрацыі: «Книжка на ладошке – 2022», «Детективное агентство братьев Гримм», «Сказки-сказочки», «КнижКино», «Знаешь – отвечай, не знаешь – прочитай!», «По неведомым дорожкам» (за што бібліятэка атрымлівае дыпломы і памятныя сертыфікаты). Асобая ўвага надаецца прасоўванню беларускай кнігі і папулярызацыі творчасці айчынных аўтараў.

Зараз Александрыйская сельская бібліятэка паспяхова адаптуецца да новых сацыяльных умоў, пашырае сферу сваёй дзейнасці. Ладзіць мерапрыемствы, накіраваныя на выхаванне любові да родных мясцін, гонару за сваіх землякоў, экалагічнае, духоўнае і сямейнае выхаванне, папулярызацыю здаровага ладу жыцця, папярэджанне правапарушэнняў, дапамагае падлеткам зрабіць усвядомлены выбар будучай прафесіі. Змястоўная і шматгранная работа з дзецьмі, творчы падыход да справы спрыяюць прыцягненню да лепшых узораў айчыннай і сусветнай літаратуры, фарміраванню іміджу бібліятэкі як культурна-адукацыйнага цэнтра аграгарадка. Нездарма па выніках працы Александрыйская сельская бібліятэка – пераможца XXXI Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» ў намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем».

Summary

The article deals with the activities of the Alexandria rural library of the Centralized library network of the Shklov region.